# Аб мерах забяспечання высокай ураджайнасці сельскагаспадарчых культур і росту прадуктыўнасці жывёлагадоўлі ў калгасах і соўгасах Беларускай ССР у 1952 годзе[1]

Н. С. ПАТОЛІЧАЎ

Таварышы! На абмеркаванне пленума ЦК КП(б)Б пастаўлена пытанне аб мерах забяспечання высокага ўраджаю і росту прадуктыўнасці грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах і соўгасах рэспублікі ў 1952 годзе.

Распрацоўка і ажыццяўленне мерапрыемстваў, якія забяспечваюць паспяховае вырашэнне пастаўленых задач, магчымы толькі на аснове ўсебаковага крытычнага разбору стану работы партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў, крытычнага разбору вынікаў работы за прайшоўшы год, смелага і рашучага выкрыцця ўсіх недахопаў і памылак, усебаковага ўліку рэальных магчымасцей для сур'ёзнага палепшання нашай работы.

Сельская гаспадарка рэспублікі з'яўляецца важнейшай галіной народнай гаспадаркі і патрабуе ад партыйных арганізацый велізарнай увагі. Узняць сельскую гаспадарку на належную вышыню, як гэтага патрабуюць ад нас ЦК ВКП(б) і Саюзны ўрад, — гэта ў сучасны момант галоўная і рашаючая задача Кампартыі (большэвікоў) Беларусі. Вось чаму, разглядаючы вынікі работы партыйных арганізацый у калгасным будаўніцтве, мы звяртаемся да сур'ёзнага разбору дзейнасці ўсіх звенняў партыйнага, савецкага і сельскагаспадарчага апарата, падвяргаем сур'ёзнай праверцы стан усёй нашай палітычнай, арганізатарскай і гаспадарчай работы. Пры гэтым Кампартыя (большэвікоў) Беларусі ў поўнай меры павінна ўлічваць, што важнейшай умовай паспяховага вырашэння задач, якія стаяць перад рэспублікай, з'яўляецца далейшы ўздым палітычнай, ідэалагічнай, арганізатарскай і гаспадарчай дзейнасці партыйных арганізацый.

Большэвіцкая партыя пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна цяпер, як ніколі, у небывалых маштабах, з выключнай настойлівасцю і ўменнем вядзе гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. Паспяхова закончана пасляваенная пяцігодка. У 1951 годзе наша краіна дасягнула новых выдатных поспехаў у развіцці эканомікі і культуры. Гіганцкае будаўніцтва гідратэхнічных збудаванняў і электрычных станцый, якое разгарнулася на Волзе, Дану, Дняпры і Аму-Дар'і, названых народам будоўлямі камунізма, знамянуе новы этап у барацьбе савецкага народа за стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма.

Сельская гаспадарка нашай краіны таксама з года ў год ідзе ўперад. Расшыраецца пасеўная плошча, павялічваецца валавы збор збожжавых і тэхнічных культур, расце механізацыя сельскай гаспадар-

[1] Скарочаная стэнаграма даклада на VIII пленуме ЦК КП(б)Б 24 студзеня 1952 года.

кі, мацнее і развіваецца грамадская гаспадарка калгасаў. У сучасны момант партыя сканцэнтравала ўвагу ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі на вырашэнні галоўнай задачы ў калгасным будаўніцтве — далейшым павышэнні ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, усямерным развіцці грамадскай жывёлагадоўлі і павышэнні яе прадуктыўнасці.

На аснове магутнага ўздыму соцыялістычнай эканомікі і росту нацыянальнага даходу няўхільна павышаецца ўзровень матэрыяльнага і культурнага добрабыту працоўных.

Выконваючы ўказанні ЦК ВКП(б), Саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, Компартыя (большэвікоў) Беларусі вядзе вялікую работу ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, палітычнага выхавання мас. Пасляваенны пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі паспяхова выканан, а ў 1951 годзе дасягнуты новыя поспехі ў развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, у культурна-бытавым будаўніцтве. Беларускі народ, як ніколі згуртаваны вакол свайго правадыра і настаўніка таварыша Сталіна, усямерна імкнецца быць у першых радах актыўных будаўнікоў комуністычнага грамадства і аддае гэтай справе ўсе свае сілы, усю сваю творчую энергію.

Адной з важнейшых асаблівасцей работы Компартыі (большэвікоў) Беларусі ў галіне сельскай гаспадаркі ў прайшоўшым годзе з'яўляецца тое, што ўвесь комплекс сельскагаспадарчых работ праводзіўся ва ўмовах дзейнасці ўзбуйненых калгасаў. Пераважаючая большасць узбуйненых калгасаў на працягу года, паступова пераадольваючы арганізацыйныя і гаспадарчыя недахопы, умацоўвалася, складвалася як буйныя соцыялістычныя гаспадаркі. Гэта сур'ёзна садзейнічала больш арганізаванаму правядзенню ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Далей неабходна адзначыць, што к пачатку сельскагаспадарчых работ 1951 года Компартыя (большэвікоў) Беларусі забяспечыла, у асноўным, завяршэнне калектывізацыі ў Брэсцкай, Маладзечненскай, Гродненскай, Баранавіцкай, Пінскай і Полацкай абласцях. Партыйныя арганізацыі ўказаных абласцей, праводзячы сельскагаспадарчыя работы, упершыню мелі справу не з масай дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак, а з калгасамі. Маладыя калгасы ў большасці сваёй паказалі высокую арганізаванасць. Яны на працягу года ўмацоўваліся, стваралі грамадскую гаспадарку, а маладыя калгаснікі далучаліся да калектыўнай працы. Завяршэнне калектывізацыі таксама сур'ёзна садзейнічала больш арганізаванаму правядзенню сельскагаспадарчых работ.

Праводзячы ўзбуйненне калгасаў і завяршыўшы калектывізацыю, Компартыя (большэвікоў) Беларусі ўзняла на больш высокую ступень усю справу калгаснага будаўніцтва ў рэспубліцы.

Але ці поўнасцю партыйныя арганізацыі рэспублікі выкарысталі створаныя ў выніку ўзбуйнення калгасаў і завяршэння калектывізацыі спрыяльныя ўмовы для больш паспяховага вядзення сельскай гаспадаркі, для вырашэння задач павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, развіцця грамадскай жывёлагадоўлі, умацавання грамадскай гаспадаркі калгасаў і на гэтай аснове ўздыму матэрыяльнага дабрабыту калгаснікаў? Далёка не поўнасцю.

Многія партыйныя арганізацыі не здолелі ва ўмовах мінулага года дабіцца здавальняючых вынікаў, асабліва ў справе ўздыму ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі. Не поўнасцю выкарысталі з мэтай уздыму сельскай гаспадаркі і тую велі-

зарную дапамогу, якая на працягу года была аказана рэспубліцы з боку ЦК ВКП(б) і Саюзнага ўрада.

Усім вядома, з якой увагай і бацькоўскімі клопатамі адносяцца да беларускага народа таварыш Сталін, ЦК ВКП(б), Саюзны ўрад. За прайшоўшы год быў прынят рад пастаноў аб аказанні дапамогі рэспубліцы ў механізацыі сельскай гаспадаркі, асушэнні балот, арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і па многіх іншых важнейшых пытаннях развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Аб размерах дапамогі Саюзнага ўрада сельскай гаспадарцы нашай рэспублікі можна меркаваць хоць-бы па колькасці сельскагаспадарчай тэхнікі, дадзенай нам у 1951 годзе. Беларусь атрымала дадаткова вялікую колькасць трактараў, 1.589 камбайнаў, 2.900 сеялак, 2.600 культыватараў, 1.022 ільнакамбайны і ільнацерабілкі і больш 8 тысяч іншых машын і прычэпных прылад. Створана 10 машынна-меліяратыўных станцый і 100 машынна-меліяратыўных атрадаў пры МТС.

Вынікі нашай работы ў 1951 годзе маглі-б быць значна лепшымі, калі-б мы паўней выкарыстоўвалі тую велізарную дапамогу, якую аказваюць сельскай гаспадарцы рэспублікі ЦК ВКП(б) і Саюзны ўрад.

Таварышы! Цэнтральны Камітэт ВКП(б) у пастанове «Аб недахопах у кіраўніцтве ЦК КП(б) Беларусі сельскай гаспадаркай» і іншых рашэннях даў вычарпальныя ўказанні, як весці справу калгаснага будаўніцтва. Гэтыя ўказанні ЦК ВКП(б) былі пакладзены ў аснову ўсёй дзейнасці Кампартыі (большэвікоў) Беларусі па кіраўніцтву сельскай гаспадаркай у 1951 годзе.

## I. УЗНЯЦЬ УРАДЖАЙНАСЦЬ, ПАВЯЛІЧЫЦЬ ВАЛАВЫ ЗБОР УСІХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ КУЛЬТУР

У мінулым годзе ў пасеўных плошчах рэспублікі адбыліся сур'ёзныя змены. У выніку праведзенай калектывізацыі ў заходніх абласцях значна выраслі пасеўныя плошчы калгасаў. Па ўсходніх абласцях таксама меў месца прырост пасеўных плошчаў. Усяго ў параўнанні з мінулым годам пасеўныя плошчы калгасаў рэспублікі выраслі на 23,6 процанта. З усходніх абласцей найбольшы прырост пасеўных плошчаў у мінулым годзе далі калгасы Мінскай і Магілеўскай абласцей.

Значна павялічаны ў калгасах пасевы важнейшых культур: збожжавых — на 23,6 процанта, кок-сагызу — амаль у тры разы, іншых тэхнічных культур — на 17 процантаў, у тым ліку ільну — на 14 процантаў, бульбы — на 22 проценты. Упершыню за пасляваенныя гады калгасы рэспублікі перавыканалі заданне па сяўбе шматгадовых траў. Пасеяна шматгадовых траў больш леташняга на 126,6 процанта і аднагадовых траў на 26,1 процанта.

У прайшоўшым годзе рэспубліка магла-б яшчэ больш павялічыць пасеўныя плошчы за кошт асваення залежаў і пералогаў, пакрытых хмызняком, калі-б кіруючыя органы раду абласцей і раёнаў пераадолелі сваю пасіўнасць у гэтай вялікай справе. У першую чаргу гэта адносіцца да кіруючых органаў Віцебскай, Магілеўскай і Полацкай абласцей.

Пытанне аб правільным выкарыстанні грамадскіх зямель калгасаў, замацаваных на вечнае карыстанне, дастаткова шырока асвятлялася на VI пленуме ЦК КП(б)Б. Мінулы год паказаў, што ачыстка зямель

калгасаў і правільнае, высокапрадукцыйнае іх выкарыстанне з'яўляюцца неадкладнай задачай партыйных і савецкіх органаў рэспублікі. Гэта даказана на многіх прыкладах як асобных калгасаў, так і цэлых раёнаў.

За мінуўшы тэрмін ачышчана ад хмызняку 141 тысяча гектараў і ад камення — 67 тысяч гектараў зямель. Зроблена, як бачыце, яшчэ мала. Некаторыя раённыя камітэты партыі і райвыканкомы і нават абкомы і аблвыканкомы праявілі неразуменне важнасці гэтай справы, не ўзначалілі ў поўнай меры актыўнасць мас калгаснікаў.

На VI пленуме ЦК КП(б)Б паведамлялася, што калгаснікі калгаса імені Варашылава горача адгукнуліся на вядомую пастанову ЦК КП(б)Б, праявілі актыўнасць і дабіліся ў першы час нядрэнных вынікаў. У жніўні 1951 года ЦК КП(б)Б рашыў праверыць, як Барысаўскі райком партыі кіруе ачысткай зямель у калгасе імені Варашылава. Высветлілася, што райком і райвыканком забыліся пра гэтую пастанову ЦК, і іменна таму справа пайшла на спад. Міністэрства сельскай гаспадаркі рэспублікі не здолела арганізаваць выкананне плана па ўзняццю залежаў і пералогаў машынна-трактарнымі станцыямі. План выкананы толькі на 78 процантаў.

Таварышы! Мы лічым, што пленум Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі павінен строга запытаць, на якой падставе партыйныя, савецкія і сельскагаспадарчыя работнікі раду абласцей і раёнаў і Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР не праяўляюць неабходнай актыўнасці ў гэтай справе. Трэба з усёй прынцыповасцю на даным пленуме ЦК КП(б)Б яшчэ раз паставіць пытанне аб ачыстцы і высокапрадукцыйным выкарыстанні зямель у калгасах як адно з важнейшых пытанняў уздыму сельскай гаспадаркі.

Тое, што праароблена ў 1951 годзе па ачыстцы зямель, — гэта толькі пачатак вялікай і важнай работы. Вядома, ачыстка зямель — справа не лёгкая, асабліва ў тых раёнах, дзе хмызняком зараслі значныя плошчы. Улічваючы гэта, Цэнтральны Камітэт і Савет Міністраў рэспублікі прымаюць тэрміновыя меры па вырабу кустарэзаў. У 1951 годзе Інстытутам механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Акадэміі навук БССР сканструіраваны і ўжо выпрабаваны два віды кустарэзаў. Мясцовая прамысловасць атрымала заданне зрабіць у першым паўгоддзі 1952 года 150 кустарэзаў. У 1952 годзе МТС атрымаюць да 400 кустарэзаў. Гэта значна аблегчыць справу ачысткі зямель.

Невыкананне планаў асваення залежаў і пералогаў, а таксама зарастанне некаторых плошчаў хмызняком і слабая работа па іх ачыстцы не ёсць толькі колькаснае пытанне аб размерах пасеўных плошчаў. Неасваенне залежных зямель у адных калгасах і раёнах прымушае павялічыць планы сяўбы ў другіх калгасах і раёнах, тым самым у гэтых калгасах і раёнах парушаюцца работы па ўвядзенню правільных траваПольных севазваротаў, па павышэнню ўраджайнасці. Няпоўнае і недастаткова прадукцыйнае выкарыстанне грамадскіх зямель калгасамі значна змяншае валавыя зборы сельскагаспадарчых прадуктаў, стрымлівае развіццё грамадскай гаспадаркі сельгасарцелей і павышэнне ўзроўню матэрыяльнага жыцця калгаснікаў. Як відаць, гэта адно з карэнных пытанняў нашай работы па ўздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі.

У дзяржаўным плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1952 год прадугледжана расшырэнне пасеўных плошчаў: кок-сагызу — на 59 процантаў, канапель — на 108 процантаў, махоркі і цукровых буракоў — на 30 —

38 працантаў. Павялічваюцца пасевы ільну, бульбы, гародніны, кармавых культур. Прадстаіць асвоіць 140 тысяч гектараў залежаў і 50 тысяч гектараў тарфянікаў.

Важна адзначыць, што ўдзельная вага тэхнічных культур у структуры пасеўных плошчаў павялічваецца з 7,9 працанта да 8,5 працанта, кармавых культур — з 6,7 працанта да 10,3 працанта, прапашных культур — да 11 працантаў. Гэта прадыктавана інтарэсамі далейшага шпаркага развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі, павышэння ўраджайнасці палёў і развіцця грамадскай жывёлагадоўлі.

План 1952 года павінен быць выканан па ўсіх паказчыках — вось у чым задача.

Таварышы! Найбольш вострай і ўсебаковай праверцы неабходна падвергнуць работу партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў у 1951 годзе ў святле галоўнай задачы калгаснага будаўніцтва — далейшага павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і ўздыму грамадскай жывёлагадоўлі і вызначыць практычныя меры на 1952 год.

Вынікі мінулага года паказваюць, што мы не забяспечылі ў належнай меры мабілізацыі ўсіх працоўных і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў калгасаў, МТС і соўгасаў, усіх рэзерваў і магчымасцей для паспяховага выканання задачы, пастаўленай перад рэспублікай Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) па павышэнню ўраджайнасці.

Планавыя заданні па ўздыму ўраджайнасці ў 1951 годзе калгасамі рэспублікі не выкананы. Многія нашы работнікі схільны чамусьці ў якасці галоўнай прычыны невыканання планавых заданняў па ўраджайнасці выстаўляць неспрыяльныя кліматычныя ўмовы мінулага года. Безумоўна, для яравых культур умовы былі сапраўды неспрыяльныя. Але ўважлівы разгляд работы калгасаў, МТС, раёнаў і абласцей паказвае, што неспрыяльныя ўмовы мінулага года толькі ў большай ступені выявілі, як-бы агалілі ўсе тыя недахопы ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай, якія яшчэ ёсць у рэспубліцы. Значыць, калі мы ў нейкай ступені цяпер гаворым аб неспрыяльных кліматычных умовах мінулага года, то толькі з адной мэтай, каб атрымаць урокі, улічыць памылкі і недахопы, пазбегнуць іх паўтарэння ў будучым.

Разгледзім некаторыя важнейшыя пытанні, звязаныя з забяспечаннем ураджайнасці.

**Аб тэрмінах сяўбы.** 1951 год асабліва нагляднa паказаў, як многа мы праігрываем на тэрмінах сяўбы. Ранняя сяўба вясной мінулага года дазволіла многім калгасам захаваць запасы вільгаці ў зямлі на больш працяглы перыяд і тым самым, пры тых-жа ўмовах, вырасціць здавальняючы і нават добры ўраджай. У другіх калгасах, дзе не выканалі і на гэты раз адно з важнейшых агратэхнічных патрабаванняў — тэрміны сяўбы, ураджай атрыман нізкі. Такім чынам, мінулы год даў нам сур'ёзны прадметны ўрок таго, якімі згубнымі з'яўляюцца абыякавасць да агратэхнікі, кансерватызм і адсталасць у гэтай справе. Без рашучага пераадолення гэтых заган, я сказаў-бы, без іх разгрому немагчыма паспяхова вырашаць задачу ўздыму ўраджайнасці.

Вось як ішла сяўба ранніх каласавых па некаторых абласцях. Па Магілеўскай вобласці на 20 красавіка было пасеяна 4,5 працанта, а 100 працантаў было толькі на 25 мая. Значыць, сяўбу ранніх каласавых Магілеўская вобласць праводзіла каля паўтара месяцаў. Ці не ясна, што калі партыйныя і савецкія органы Магілеўскай вобла-

сці хочуць узняць ураджайнасць, гэты тэрмін трэба скараціць у 2—3 разы і выйграць два—тры тыдні. Мінская вобласць 100 працантаў пасеву ранніх каласавых забяспечыла толькі да 1 чэрвеня, на 5 дзён пазней Магілеўскай вобласці. Віцебская вобласць — на 10 чэрвеня. І на гэтым мы многае страцілі.

У чым прычыны такой маруднасці на веснавой сяўбе? Можа ў недахваце людскіх і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў? Сцвярджаць гэта было-б грубай памылкай. У выніку велізарнай дапамогі, якую аказаў рэспубліцы Саюзны ўрад, нашы магчымасці сур'ёзна ўзраслі, узнялася механізацыя ўсіх працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці. На канец 1951 года цяглавых рэсурсаў (трактары, жывое цягло) у рэспубліцы было на 38,1 працэнта больш, чым да вайны. Але можа ў нас мала сеялак? На канец 1951 года рэспубліка мела трактарных сеялак 245 працантаў к даваеннаму. Ёсць сеялкі і ў калгасах. Падлікі паказваюць, што Беларусь мае магчымасць поўнасцю сеяць выключна радковай сяўбой. У калгасе імені Леніна, Шклоўскага раёна, Магілеўскай вобласці, вясной было пасеяна 490,5 гектара яравых зерневых культур, з якіх 77 гектараў пасеяна МТС, г. зн. радковай сяўбой, а 413,5 гектара пасеяна калгасам уручную. Між тым сам калгас мае 8 сеялак. У выніку сяўба пшаніцы зацягнулася на 20 дзён, а аўса — на месяц.

Законна задаць пытанне кіраўніцтву Шклоўскага раёна і старшыні калгаса тав. Французаву, ці вядома ім, колькі калгас і калгаснікі страцілі збожжа на ручной, замест радковай, і позняй сяўбе? Законна задаць і другое пытанне — на якой падставе ў гэтым калгасе так упорна чапляюцца за адсталыя метады работы? Ці не пара пакончыць з гэтай адсталасцю.

Галоўная прычына ўсіх гэтых грубейшых парушэнняў агратэхнікі заключаецца ў слабым і павярхоўным кіраўніцтве калгасамі. Толькі няведаннем справы, няведаннем таго, як ідзе той ці іншы від сельскагаспадарчых работ, можна вытлумачыць, чаму раённыя партыйныя, савецкія і сельскагаспадарчыя органы дапускаюць такія адсталыя метады кіраўніцтва, якія прыводзяць да паніжаных ураджаяў, лішніх затрат працы, чым наносяцца вялікія страты калгаснаму будаўніцтву. Яшчэ горш, калі партыйныя і савецкія работнікі ведаюць, але мірацца, згаджаюцца з адсталасцю і руцінай. Такіх работнікаў трэба выкрываць як носьбітаў адсталасці, як людзей, якія тармозяць уздым сельскай гаспадаркі.

Вялікую адказнасць за зацяжку сяўбы і наяўнасць яшчэ ручной сяўбы нясуць дырэктары машынна-трактарных станцый, Міністэрства сельскай гаспадаркі і яго органы ў абласцях і раёнах. План радковай сяўбы вясной 1951 года МТС выканалі толькі на 65,7 процанта. Такое становішча зусім нецярпімае. Сур'ёзнай прычынай зацяжкі сяўбы з'яўляецца таксама дрэннае выкарыстанне жывога цягла на веснавых работах. Гэта прыводзіць да таго, што ўзорванне і апрацоўка зямель у веснавы перыяд, запланаваныя для жывога цягла, перакладваюцца на МТС. Але гэты аб'ём работ выконваецца машынна-трактарнымі станцыямі ў больш працяглыя тэрміны, што зацягвае сяўбу. Калі падрыхтаваць як належыць жывое цягло да веснавых палявых работ, падрыхтаваць увесь сельгасінвентар і ў поўнай меры іх выкарыстаць, — гэта дасць магчымасць намнога скараціць тэрміны сяўбы.

Міністэрства сельскай гаспадаркі не патрабуе з усёй рашучасцю ад сваіх органаў на месцах і спецыялістаў сельскай гаспадаркі цвёрдасці

і настойлівасці ў ажыццяўленні агратэхнічных мерапрыемстваў. І далёка не ўсе яшчэ нашы спецыялісты рашуча змагаюцца за передавое і прагрэсіўнае, супроць нарушэнняў агратэхнікі, супроць нізкага ўзроўню земляробства, супроць бракаробаў і кансерватараў, нядбайных і адсталых людзей. Пры вялікай арміі спецыялістаў, пры пастаянным кантролі і кіраўніцтве партыйных органаў, пры наяўнасці адказных кіраўнікоў, якімі з'яўляюцца старшыні калгасаў і дырэктары МТС, пры наяўнасці пярвічных партыйных арганізацый мы маем магчымасць узняць культуру соцыялістычнага земляробства.

**Зяблевае ворыва.** Вядома, што зяблевае ворыва з'яўляецца адным з важнейшых агратэхнічных мерапрыемстваў у барацьбе за ўздым ураджайнасці. З прычыны таго, што з ворывам зябліва ў 1951 годзе, па ўсім вядомых прычынах, былі цяжкасці, многія дырэктары МТС чамусьці рашылі, што гэтыя цяжкасці непераадольныя, і са спакойным сумленнем ужо ў верасні, асабліва пасля заканчэння сяўбы азімых, прыступілі да згортвання палявых работ, сцягвання трактараў на сядзібы МТС. Гэтыя дырэктары МТС груба нарушылі дзяржаўную дысцыпліну. Недапушчальна безадказна аднесліся да зяблевага ворыва і многія старшыні калгасаў. Яны прымірыліся з тым, што МТС спынілі ворыва зябліва, не арганізавалі работу жывога цягла. Стваралася такое становішча, калі большасць калгасаў павінна была застацца зусім без зябліва, што ставіла пад удар ураджай 1952 года. І толькі пад вялікім націскам ЦК і Совета Міністраў БССР нам удалося сёе-тое зрабіць. Але рэспубліка і ў 1951 годзе не выканала вядомае патрабаванне ЦК ВКП(б) і Саюзнага ўрада аб пераходзе да сяўбы яравых поўнасцю па зяблеваму ворыву. Асабліва дрэнна гэтая задача вырашаецца ў Мінскай, Віцебскай, Полацкай і Маладзечненскай абласцях, дзе план узняцця зябліва выканан у межах 48 — 60 процантаў. З гэтага вынікае, што рад абкомаў і райкомаў партыі, аблвыканкомаў і райвыканкомаў усё яшчэ не навучыліся цвёрда трымаць у сваіх руках асноўныя, рашаючыя пытанні сельскай гаспадаркі.

Такім чынам, для забяспечання высокага ўраджаю ўсіх сельскагаспадарчых культур ў 1952 годзе неабходна рашуча скараціць тэрміны сяўбы за кошт поўнага выкарыстання тэхнікі МТС, жывога цягла і сельскагаспадарчай тэхнікі калгасаў. Трэба ўдзяліць вялікую ўвагу падрыхтоўцы да вясны як трактараў, так і жывога цягла. Далей, неабходна правесці ўсю сяўбу радковым спосабам, які дае больш высокую ўраджайнасць, весці рашучую барацьбу за высокую агратэхніку, не прапускаць ніводнага факта нізкай якасці і браку ў рабоце.

**Угнаенне палёў.** На VI пленуме ЦК КП(б)Б пытанне аб угнаенні палёў было пастаўлена дастаткова ясна і востра. На 1951 год быў прыняты план вывазкі арганічных угнаенняў значна большы, чым у папярэднія гады. Чаго мы дабіліся? За год вывезена на палі 40.694 тысячы вазоў гною, супроць 29.396 тысяч вазоў у 1950 годзе, што складае да плана 90,4 процанта. Пры гэтым Палеская вобласць план выканала толькі на 65 процантаў, Мінская — на 76,8 процанта. Торфу вывезена на палі 4.870 тысяч тон супроць 3.034 тысяч тон у 1950 годзе. Зроблен пэўны крок уперад, але вынікі вельмі скромныя, яны ніяк не адпавядаюць пастаўленай перад намі задачы — уздыму ўраджайнасці. Асабліва вялікую трывогу выклікаюць няправільныя адносіны да выкарыстання торфу як важнейшага віду арганічных угнаенняў.

**Наяўныя магчымасці Полацкай і Віцебскай абласцей прыблізна аднолькавыя, але вынікі па вывазцы ўгнаенняў, і асабліва торфу, розныя.**

Полацкая вобласць выканала план вывазкі гною на 106 працантаў і вывезла на калгасныя палі 850 тысяч тон торфу. У той-жа час больш буйная Віцебская вобласць вывезла ўсяго толькі 180 тысяч тон торфу, альбо амаль у 5 разоў менш, чым Полацкая вобласць. Можа, кіраўніцтва Віцебскай вобласці лічыць, што магчымасцей у Полацкай вобласці ў 5 разоў больш, чым у Віцебскай? Ясна, што тут справа ў іншым.

Слабая работа, праведзеная ў 1951 годзе па здабычы і вывазцы торфу на палі, гаворыць аб тым, што многія нашы кіруючыя кадры толькі на словах прызналі важнасць угнаення палёў у шырокіх маштабах для ўздыму ўраджайнасці, а на справе нічога сур'ёзнага не прадпрынялі.

Сёй-той быў не супроць таго, каб хутчэй забыць рашэнні VI пленума ЦК КП(б)Б. Цяперашні пленум павінен яшчэ раз з усёй бальшэвіцкай прынцыповасцю сканцэнтраваць увагу партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых арганізацый на пытанні ўгнаення палёў, як важнейшай умове ўздыму ўраджайнасці.

У радзе месц накоплен станоўчы вопыт, які дае поўны адказ на тое, як неабходна арганізаваць справу нарыхтоўкі і вывазкі ўгнаенняў. Глыбокаўскі раён, Полацкай вобласці, за 1951 год вывез на палі 103 тысячы тон гною і 263 тысячы тон торфу. Гэта значна больш, чым вывезлі калгасы ўсёй Віцебскай вобласці, хоць у Глыбокаўскім раёне 37 калгасаў, а ў Віцебскай вобласці 690. І гэта амаль у два разы больш, чым вывезлі ўгнаенняў калгасы Пінскай вобласці. У чым-жа прычына? Справа ў тым, што партыйная арганізацыя Глыбокаўскага раёна, райком партыі, савецкія і сельскагаспадарчыя органы, пры вялікай актыўнасці камсамольскай арганізацыі, па-бальшэвіцку аднесліся да ўказанняў ЦК ВКП(б) аб уздыме ўраджайнасці, улічылі парады і ўказанні VI пленума ЦК КП(б) Беларусі. Партыйная арганізацыя Глыбокаўскага раёна дабілася таго, што ў кожным калгасе былі створаны спецыяльныя брыгады па здабычы і вывазцы ўгнаенняў, правяла вялікую растлумачальную работу сярод калгаснікаў, арганізавала справу так, што здабыча торфу праводзілася на працягу ўсяго лета. У выніку раён заклаў трывалую аснову для атрымання высокага ўраджаю ў 1952 годзе.

Трэба дабіцца, каб ва ўсіх раёнах, ва ўсіх калгасах справа накаплення і вывазкі ўгнаенняў была арганізавана так, як у калгасах Глыбокаўскага раёна, як у многіх перадавых калгасах рэспублікі. Трэба пераадолець коснасць у гэтай важнай справе, прымусіць усе кіруючыя кадры калгасаў, усе партыйныя, савецкія і сельскагаспадарчыя органы арганізаваць выкананне ўстаноўленых планаў, узняць на гэтую справу шырокія масы калгаснікаў. Неабходна стварыць пастаянна дзеючыя брыгады ў калгасах, а там, дзе гэтага зрабіць не прадстаўляецца магчымым, выдзеліць пастаянныя групы людзей у саставе паляводчых брыгад. Арганізуючае значэнне гэтых брыгад, як паказвае вопыт, вельмі вялікае. Совет Міністраў СССР у рашэнні ад 28 красавіка 1951 года рэкамендаваў усім калгасам выдзеліць пэўную групу калгаснікаў з неабходнай колькасцю жывога цягла для вывазкі гною і торфу, не адцягваючы іх на іншыя работы.

Калі гэтыя брыгады і пастаянныя групы людзей будуць ва ўсіх калгасах весці работу круглы год, мы безумоўна даб'емся таго, што ўвесь накоплены на калгасных дварах гной будзе вывозіцца на палі. Нямала гною можна вывезці і з двароў калгаснікаў. Трэба шырока паставіць нарыхтоўку торфу з тым, каб вазіць яго на палі ў сухім выглядзе, ар-

ганізаваць, як гэта ўжо шырока робяць у Глыбокаўскім раёне, выкарыстанне торфу на падсцілку, кампасціраванне яго з гноем і г. д.

Прадстаўляе вялікую цікавасць і тое, як у 1951 годзе былі размеркаваны мясцовыя ўгнаенні (гной і торф). З 18 мільёнаў тон пад яравыя культуры пайшло 13 мільёнаў 818 тысяч тон і пад азімыя культуры — 4 мільёны 213 тысяч тон. Яравыя зерневыя і бабовыя атрымалі 3 мільёны 650 тысяч тон, бульба — 8 мільёнаў 767 тысяч тон, астатняе пайшло пад лён і іншыя культуры. З прыведзеных даных відаць, што азімае жыта, якое з'яўляецца галоўнай харчовай культурай у рэспубліцы, не атрымала патрэбнай колькасці ўгнаенняў. Пад яравыя зерневыя, ураджайнасць якіх яшчэ нізкая, аб чым даволі падрабязна гаварылася на VI пленуме ЦК КП(б)Б, таксама мала ўнесена ўгнаенняў. Што датычыць тэхнічных культур і бульбы, то тут мы маем па раду абласцей многа фактаў, калі іх сяўба праводзілася па няўгноеных глебах. Значыць, галоўны вывад з усяго сказанага той, што накапленне і вывазку ўгнаенняў неабходна рашуча ўзняць.

У гэтым годзе калгасы рэспублікі павінны вывезці на палі 44 мільёны тон гною і торфу. Гэта амаль у два з палавінай раза больш, чым фактычна было ўнесена ўгнаенняў на калгасныя палі ў мінулым годзе. Вырашэнне гэтай вялікай задачы немысліма без мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў калгасаў, МТС, без штодзённага і цвёрдага кіраўніцтва партыйных і савецкіх органаў гэтай важнай справай.

Мы павінны зрабіць сур'ёзнае папярэджанне кіраўнікам партыйных і савецкіх органаў абласцей і раёнаў, якія правальваюць гэтую важную справу.

ЦК КП(б)Б і Совет Міністраў рэспублікі ясна разумеюць, што забяспечыць накапленне і вывазку такога аб'ёму ўгнаенняў справа нялёгкая. Нам асабліва неабходна дабіцца механізацыі здабычы торфу. У некаторых калгасах здабываюць торф лапатамі. Так многа не зробіш. Больш мэтазгодна, больш прадукцыйна, як і робяць перадавыя калгасы, здабываць торф паслойна-паверхневым спосабам пры дапамозе прасцейшых механізмаў.

Саюзны ўрад аказвае вялікую дапамогу рэспубліцы мінеральнымі ўгнаеннямі. Нам неабходна больш эфектыўна выкарыстаць іх шляхам гранулявання з перагноем і торфам. Гэтая справа ў нас пакуль яшчэ ў зародкавым стане.

Неабходна таксама пераадолець няправільныя адносіны ў радзе раёнаў да лубіну, да яго пасеву на зялёнае ўгнаенне, як важнейшага сродку павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. Асабліва недапушчальна знізіліся пасевы лубіну ў заходніх абласцях. ЦК КП(б) Беларусі вымушан быў асобна абмеркаваць пытанне аб нездавальняючым стане з пасевамі лубіну ў многіх раёнах Гродненскай, Баранавіцкай, Брэсцкай і Маладзечненскай абласцей.

Хацелася яшчэ спыніцца на вапнаванні кіслых глеб. Яно мае першаступеннае значэнне ва ўмовах Беларусі. Акадэмік Т. Д. Лысенка ў гутарцы з беларускімі калгаснікамі звярнуў на гэта нашу ўвагу. У 1951 годзе план вапнавання кіслых глеб па рэспубліцы выканан толькі на 53 працэнты. Вапнаванне праводзілася толькі ў 25 раёнах. А ў такіх абласцях, як Гомельская, Палеская, Полацкая, Бабруйская, Брэсцкая і Маладзечненская, зусім не праводзілася.

Вапнаванне кіслых глеб — адно з важнейшых агратэхнічных мерапрыемстваў у павышэнні ўраджайнасці, якое забяспечвае лепшае развіццё мікрафлоры ў глебе. Яно садзейнічае разлажэнню раслінных астат-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

каў гною і торфу, нейтралізуе празмерную кіслотнасць глебы, вельмі шкодную для росту і развіцця сельскагаспадарчых культур. Але гэтае мерапрыемства, як бачыце, укараняецца слаба, хоць і навукова і практычна ў радзе калгасаў яно абгрунтавана і даказана. Магу спаслацца на вынікі вопытнай станцыі «Вусце» (Віцебская вобласць), дзе ўраджай канюшыннага сена пры вапнаванні склаў 47,1 цэнтнера з гектара супроць 18,6 цэнтнера без вапнавання, Турскай вопытнай станцыі (Гомельская вобласць), дзе ўраджай канюшыннага сена склаў 67,3 цэнтнера з гектара супроць 32 цэнтнераў без вапнавання, калгаса «1 Мая» Клімавіцкага раёна, дзе ў выніку вапнавання ўраджай яравой пшаніцы даў прырост на 5,1 цэнтнера на гектар па збожжу і на 8,3 цэнтнера па саломе і інш.

Таварышы! Уздым ураджайнасці на беларускіх палях нямыслім без самай шырокай арганізацыі накаплення і прымянення ў вялікіх размерах усіх відаў угнаенняў, прымянення ўсіх неабходных агратэхнічных мерапрыемстваў, якія павышаюць урадлівасць глебы. Кампартыя (большэвікоў) Беларусі, усе кіруючыя кадры партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў, спецыялісты сельскай гаспадаркі павінны ўдзяляць максімум увагі гэтай справе, дапамагчы калгасам мабілізаваць усе свае працоўныя і матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы.

Планы на 1952 год па ўгнаенню палёў і правядзенню іншых агратэхнічных мерапрыемстваў, якія павышаюць урадлівасць глеб, зацверджаны. Важна цяпер, не трацячы часу, арганізаваць іх выкананне ва ўсіх калгасах. Асабліва трэба выкарыстаць зіму для вывазкі ўгнаенняў. Няхай кожная партыйная арганізацыя, кіраўнік калгаса, МТС, соўгаса, кожны райком, райвыканкам, кожны спецыяліст сельскай гаспадаркі, усе кіруючыя органы пранікнуцца пачуццём найвялікшай адказнасці за справу ўздыму ўраджайнасці, а значыцца, і за справу правядзення ўсіх прадугледжаных планам мер. Няхай у нашых кадраў будзе больш рашымасці правесці гэтыя мерапрыемствы і дабіцца высокага ўраджаю.

**Асушэнне балот і асваенне тарфянікаў.** Гэтае пытанне выходзіць далёка за межы задач, якія стаяць перад намі ў 1952 годзе па ўздыму ўраджайнасці. Сельскагаспадарчае асваенне тарфяна-балотных глеб адкрывае шырокія перспектывы для далейшага развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі, для павышэння ўраджайнасці і павелічэння валавога збору збожжа, тэхнічных культур, для стварэння трывалай кармавой базы ў жывёлагадоўлі. Гэта практычна даказана многімі калгасамі і соўгасамі. Вось чаму задача асушэння і асваення балотных зямель павінна стаяць у радзе самых важных пытанняў сельскай гаспадаркі.

Многія раёны і вобласці правялі ў гэтай справе вялікую работу. У цэлым план асушкі балот па рэспубліцы за 1951 год значна перавыканан. Асабліва трэба адзначыць актыўнасць такіх раёнаў, як Рудзенскі, Пухавіцкі і рад іншых. Але ўсё-ж многія раёны не выканалі дзяржаўных планаў асушэння балот, і сям-там яшчэ мае месца недаацэнка гэтай справы.

Саюзны ўрад аказвае выключную дапамогу рэспубліцы ў асушэнні балот і асваенні тарфянікаў. У рэспубліцы створаны 10 новых машынна-меліяратыўных станцый і 100 меліяратыўных атрадаў пры МТС. У рэспубліцы арганізавана вытворчасць канавакапальнікаў. Гэтая машына, сканструіраваная Інстытутам механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Акадэміі навук БССР, дае магчымасць механізаваць найбольш працаёмкую і цяжкую работу па асушэнню балот — пракладку асушальных канаў.

1951 год быў плённым у тым сэнсе, што рэспубліка атрымала комплекс меліяратыўных машын, сканструіраваных вучонымі. Створана база

па вытворчасці гэтых машын. Гэта дае магчымасць ужо ў 1952 годзе значна павялічыць аб'ём работ па асушэнню балот. Апрача таго, у Рудзенскім раёне Інстытутам механізацыі сумесна з раённымі органамі праведзена даследчая работа па комплекснаму выкарыстанню створанай тэхнікі.

Створаны такія ўмовы, пры якіх можна (гэта так і будзе) тэмпы асушэння і асваення багацейшых балотных зямель рэспублікі значна ўзняць.

У 1952 годзе, згодна ўказання Саюзнага ўрада, будзе створана яшчэ 5 машынна-меліяратыўных станцый і 100 меліяратыўных атрадаў.

Таварышы! Нам неабходна пераадолець у справе асушэння балот цэлы рад недахопаў і больш рашуча рушыць яе ўперад. У чым заключаюцца гэтыя недахопы?

Міністэрства сельскай гаспадаркі і Міністэрства меліярацыі БССР не праяўляюць неабходнай аператыўнасці і настойлівасці ў правядзенні вышукальных і праектных работ. Адсутнасць праектнага матэрыялу ўжо цяпер пачынае стрымліваць разгортванне меліяратыўных работ у шырокіх маштабах.

Дрэнна выкарыстоўваецца наяўная тэхніка. Слаба яшчэ прыцягваюцца калгасы, іх сілы і сродкі як для асушальных работ, так і для догляду за існуючай асушальнай сеткай. Нізкая яшчэ якасць апрацоўкі тарфяных зямель.

Совет Міністраў СССР паставіў перад Беларускай ССР вялікую задачу па асушэнню і сельскагаспадарчаму асваенню балот у 1951—1955 гг. пад пасевы зерневых, тэхнічных культур і асабліва кок-сагызу, а таксама па асушэнню і паляпшэнню сотняў тысяч гектараў лугоў і пашаў. Гэтае заданне мы павінны значна перавыканаць. Для гэтага ёсць усе магчымасці. Цэнтральны Камітэт упэўнен, што ў гэтай важнай для ўздыму сельскай гаспадаркі справе партыйныя і совецкія органы прыкладуць максімум намаганняў. ЦК будзе ўсяляк падтрымліваць імкненне калгасаў, соўгасаў, МТС, раёнаў і абласцей да перавыканання плана асушэння балот, да хутчэйшага асваення тарфяных зямель і атрымання высокіх ураджаяў на гэтых землях.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі